■ Паміж жыццём і смерцю

УДЗЯЧНЫЯ ВАЙНЕ ЗА... КАХАННЕ

«Яны настолькі ўсё жыццё кахалі адно аднаго, што я заўсёды думала: што ўсе людзі такія, што ўсе так жывуць», — пачынае гутарку Жанна Кацянкова, да якой я прыйшла, каб даведацца пра дзіўны лёс гэтай сям'і. Гісторыя жыцця яе бацькоў — прыклад таго, як трэба кахаць. І гэта нягледзячы на тое, што яно, каханне, было выпрабавана самым страшным — вайной...

Яны пазнаёміліся ў тыя далёкія сарака-выя-ракавыя. На фронце. Убачыўшыся ўсяго толькі раз, не маглі жыць адно без аднаго. Аднак увесь час быць разам проста не маглі. Не мелі права. Вайна-ліхадзейка іх то разлучала, то зноў зводзіла разам. Але менавіта ёй яны былі ўдзячныя, бо каб не вайна, не было б і гэтай сям'і, і гэтай гісторыі.

Ілья ЛЕЙБМАН і Алена КАЦЯНКОВА. 1945 год.

Беглі са сталіцы...

Ілья Лейбман нарадзіўся ў 1921 годзе ў Мінску. Калі пачалася вайна, ён заканчваў трэці курс Беларускага медыцынскага інстытута (цяпер Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт). Якраз здаваў апошні экзамен, пасля якога, захапіўшы ўсе дакументы, разам са сваёй сям'ёй, суседзямі і тысячамі мінчан вымушаны быў бегчы са сталіцы.

— Толькі на пахаванні бацькі я даведалася, што ўвесь гэты няпросты і доўгі шлях ён нёс на сваіх плячах суседскага хлопчыка, — расказвае дачка. — Сам ён ніколі пра гэта не казаў. Магчыма, не лічыў патрэбным.

Так, лясамі і балотамі, дайшлі да Магілёва. Адтуль трапілі ў эвакуацыю ў Фрунзэ. Там экстэрнам — год лічыўся за два — Ілья скончыў Кіргізскі медыцынскі інстытут. І адразу пасля атрымання дыплома яго забралі на фронт. Ішоў 1942 год...

На фронт. Добраахвотнікамі

Ён ніводнага дня не быў у тыле, не знаходзіўся і ў прыфрантавым шпіталі. Ілья Лейбман адразу трапіў на перадавую. Быўшы ўрачом санітарнай лятучкі, ён ішоў разам з войскамі, аказваючы падчас і пасля баёў першую медыцынскую дапамогу параненым салдатам і афіцэрам.

Наколькі гэта было складана і фізічна, і маральна, добра ведала яго каханая. Алена Кацянкова ваявала старшым сяржантам медслужбы ў складзе 996-й ваенна-санітарнай лятучкі 6-й арміі 3-га Украінскага фронту. Маладая медсястра была родам з Казані. Да вайны скончыла тры курсы Казанскага мед-інстытута. Толькі тады давучыцца ёй так і не давялося, хоць і была такая магчымасць.

Жыць спакойным жыццём, калі там, зусім недалёка, гінуць і пакутуюць ад болю людзі, яна не магла. І разам з сястрой Алена Кацянкова пайшла на фронт. Добраахвотнікам.

Маладая дзяўчына прайшла ўсю вайну. У яе ваенным білеце, які беражліва захоўвае дачка, пазначаны наступныя даты: 25 ліпеня 1941 года і лістапад 1945-га. 9 мая Алена Кацянкова сустрэла ў Вене. Той дзень стаў для яе другім днём народзінаў. І не толькі таму, што гэта Дзень Перамогі.

— Калі яна везла параненых, на іх напалі ўласаўцы, якія, па расказах мамы, былі яшчэ больш жорсткімі, — распавядае Жанна Кацянкова. — І літаральна ў долю секунды падышлі нашы войскі і іх выратавалі. Спазніліся б яны ўсяго на пяць хвілін — усе б загінулі... Таму 9 мая быў для яе асаблівым днём. У гэты дзень яна апранала сваю чорную сукенку, вешала на яе ўсе свае ўзнагароды і святкавала.

— Колькі памятаю сваю маму, яна ўвесь час курыла, — працягвае дачка. — І паколькі сама медык, я з ёй увесь час на гэты конт сварылася. Перастала, калі аднойчы яна мне сказала наступнае: «Я курыла пад Сталінградам. Волга была чырвоная ад крыві...»

Пісалі, быццам у апошні раз...

Усю вайну Ілья Лейбман і Алена Кацянкова прайшлі на перадавой. Былі то ў адной ваенна-санітарнай лятучцы, то ў розных. Увесь час знаходзіліся паміж жыццём і смерцю: куля ж не выбірае — салдат ты ці ўрач. Шмат медыцынскіх работнікаў загінула...

Ім было цяжэй за ўсё. На іх вачах паміралі людзі, пакутавалі ад страшных боляў параненыя. Яны моцна перажывалі, што часам як медыкі былі бяссільныя... І ў той жа час перажывалі асабістую трагедыю.

Прайшоўшы вайну,
яна так і не навучылася быць
абыякавай да чужых праблем.
Чужыя пакуты былі
яе асабістым болем.

У тыя цяжкія дні расстання яны пісалі адно аднаму лісты. Пісалі вельмі шчыра — так, як быццам у апошні раз. Гэтыя франтавыя трохвугольнікі як самую каштоўную сямейную рэліквію захоўвае дачка. Разгарнуўшы некалькі з іх, здаецца, што іх толькі даслалі з фронту...

*«Мілы, родны мой Люсік (Ілья. — **Аўт.**)! Прывітанне! Цяжка на душы пасля нашага ад'езду. Дакладней, пасля таго, як мы з табой рассталіся. Я проста не знаходжу сабе месца. Цягне нешта невядомае. Выйду на падножку або пагляджу ў акно — ці не ідзеш ты. Але цябе няма... Я сябе супакойваю толькі тым, што хутка павінна ўбачыць цябе.*

Мілы Люсік! Я, напэўна, па тысячы разоў на дзень перачытваю твае лісты... Жыццё без цябе мне няміла. Я зараз самотная, як кропля дажджу на лісце бярозы, якая чакае чарговага парыву: панясе яе і хто ведае куды?.. Мне так становіцца сумна, калі прамільгне думка аб тым, што я не так хутка ўбачу цябе... Люсік, родны, чаму цябе няма са мной, чаму ўсё так? Вядома, у гэтым вінавата вайна. Праўда, яна ж вінаватая ў нашай сустрэчы. Каб не яна, я б цябе не ведала. Я яе ў адным вельмі вінавачу, што яна разлучыла нас... Да пабачэння! Моцна цябе цалую. Лена» (1 кастрычніка 1944 года).

А вось што пісаў Ілья Лейбман каханай Алене 25 студзеня 1945 года:

«Прывітанне, мой дарагі Лянусік! Пішу табе на выпадак, калі я з табой размінуся. Па-першае, паведамляю, што я сёння ў аддзеле атрымаў твае два лісты і табе сардэчна ўдзячны. Мне вельмі крыўдна было чытаць твой ліст. Ты мяне ў ім папракаеш. А хіба я заслужыў гэта? Ты ведаеш мае пачуцці да цябе. Ты ведаеш, што я цябе кахаю да смерці.

Як хочацца мне з табой сустрэцца і падрабязна пра ўсё пагаварыць! Бо ты ў мяне адна, адна на ўсім свеце, за выключэннем бацькоў. Я беззапаветна кахаю, як звар'яцелы. Спадзяюся, што неўзабаве мы зноў сустрэнемся, а галоўнае, што хутка кончыцца вайна. І тады мы будзем назаўсёды разам. Моцна цалую. Твой Ілья».

Былі шчаслівымі, што выжылі

— Самае дзіўнае, што бацькі ніколі нічога адмоўнага пра вайну не казалі, — узгадвае Жанна Кацянкова. — Ва ўсіх іх аповедах заўсёды было нешта станоўчае. Відаць, яны настолькі былі шчаслівымі, што абое выжылі, што не хацелася ўспамінаць увесь той жах. Я вельмі добра памятаю, як тата расказваў, што, калі яны ўвайшлі ў Адэсу, адэсіты паставілі на ўсю Дэрэбасаўскую сталы і шчодра частавалі нашых салдат. Мама расказвала, што самым страшным на вайне былі абгарэлыя танкісты. Гэта жудасныя болі і жах...

Трымаю ў руках паштоўку, аднагодку Перамогі. Дата адпраўкі — 10 мая 1945 года. У ёй Ілья Лейбман віншуе Алену з Вялікай Перамогай: *«Мілая, Лянусік! Віншую, мая дарагая, з Перамогай! Мілы Лянусік, нарэшце вайна скончана і мы з табой зажывём выдатна! Яшчэ раз віншую цябе з Перамогай і зычу табе шчасця, галоўнае — здароўя».*

Ілья Лейбман і Алена Кацянкова служылі разам, калі нашы войскі вызвалялі Захад. Па Еўропе за імі шлі і яны. Ужо — удваіх. У лістападзе 1945 года вярнуліся ў Мінск. У снежні нарадзілася іх адзіная дачушка.

— Для мамы вайна магла скончыцца значна раней, — упэўнена Жанна Ільінічна. — Але яна нікому не казала, што цяжарная, бо яе адправілі б у тыл. А яна хацела быць з бацькам, са сваім каханым.

Жыццё пасля вайны

Дзіўна, але бацькоўская хата, куды яны вярнуліся пасля вайны, захавалася. Мінск быў амаль цалкам зруйнаваны. А дом пад нумарам 21 на вуліцы Ульянаўскай — драўляны! — стаяў цалюткі, быццам чакаў сваіх гаспадароў.

Ілья Лейбман уладкаваўся на працу патолагаанатамам. Як расказвае дачка, у пасляваенным Мінску не было ніводнай вакантнай лячэбнай пасады. Нават хацеў з'ехаць. Пераканаў маладога ўрача бацька, які сказаў, што ў любой прафесіі можна знайсці цікавасць. Ілья Лейбман пачаў займацца навукай і ў 1952 годзе абараніў кандыдатскую дысертацыю. Пасля быў галоўным патолагаанатамам Беларускай чыгункі, займаўся навукай у Скурна-венералагічным інстытуце.

Яго жонка, Алена Кацянкова, пасля нараджэння дзіцяці пайшла вучыцца далей. Скончыўшы Мінскі медыцынскі інстытут у 1948 годзе, пачала працаваць у Дом малюткі № 1, які аднавіў сваю працу адразу пасля вызвалення беларускай сталіцы. Адзінокіх немаўлят, якіх пасля вайны засталося вельмі шмат, прынесілі сюды з бальніц, з лясоў, дзе іх знаходзілі. Падкідвалі дзяцей і самі бацькі: не было чым карміць — пасляваенны голад і разруха.

Праз два гады Алена Кацянкова стала галоўным урачом установы і на гэтай пасадзе адпрацавала 36 гадоў. У 1966 годзе за сваю самаадданую працу яна была ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, пазней на яе святочнай вопратцы з'явіўся значок «Выдатнік аховы здароўя».

Родная для чужых

— Мама настолькі любіла гэтых дзяцей, што сама старанна падбірала персанал, — успамінае дачка. — Яна часта ім казала, што калі прыйшлі працаваць з дзецьмі-сіротамі, то павінны ім аддаваць цяпло, мацярынскую любоў. У мамы была надзвычайная памяць: яна ведала лёс кожнага дзіцяці — іх было 160! Аднойчы прыйшлі муж і жонка, каб усынавіць каго-небудзь. Мама глядзіць на гэтую жанчыну і ўспамінае, што тая калісьці адмовілася ад роднага дзіцяці. Пацвердзіўшы свае здагадкі дакументальна, яна ім сказала, што калі яны маглі адмовіцца ад свайго, то чужога не атрымаюць.

Калі дзеці падрасталі, іх аддавалі ў інтэрнат. Ужо дарослымі многія з іх прыходзілі ў Дом малюткі і хацелі даведацца пра сваіх бацькоў. Аднойчы звярнуўся сюды і адзін малады чалавек. Алена Кацянкова ўспомніла, што яго маці некалі адмовілася ад сына ў 2-й дзіцячай бальніцы. Жанчыну адшукаць усё ж такі ўдалося. Малады чалавек сустрэўся са сваёй маці, якая яго так і не прызнала.

— Ён вярнуўся да маёй мамы і падзяліўся сваімі перажываннямі, — дадае Жанна Кацянкова. — Яна яго супакоіла. І, ужо сыходзячы, ён расплакаўся і сказаў, што так, як мая мама паставілася да яго, не прымала яго нават родная маці...

Яе ўсе любілі і ў той жа час баяліся. Алена Кацянкова за 36 гадоў свайго кіраўніцтва стала жанчынай-легендай, выдатным урачом, самай ласкавай і добрай маці для сотні дзяцей. Прайшоўшы вайну, яна так і не навучылася быць абыякавай да чужых праблем. Чужыя пакуты былі яе асабістым болем.

Увогуле лёс гэтай сям'і надзвычай цікавы. Ілья Лейбман і Алена Кацянкова пражылі разам 49 гадоў! Выхавалі дачку Жанну, унучку Алену, якія таксама сталі ўрачамі. Сямейную дынастыю працягваюць цяпер і іх праўнукі: Ілья працуе ўрачом у шведскай клініцы, Малін заканчвае другі курс замежнага медыцынскага ўніверсітэта.

Алена Кацянкова не надоўга перажыла свайго мужа: жыць без яго, як і тады, у вайну, проста не магла. І не хацела...

* * *

Неўзабаве ў Доме дзіцяці № 1 для дзяцей з арганічным пашкоджаннем цэнтральнай нервовай сістэмы і псіхікі (яго сучасная назва) адкрыецца стэнд, прысвечаны памяці Алены Кацянковай. Людзі, якія працавалі з ёй не адзін год запар, выступаюць і за тое, каб у год 70-годдзя Вялікай Перамогі на ўстанове, якую ў самы цяжкі галодны пасляваенны час на працягу 36 гадоў узначальвала Алена Кацянкова, у гонар выдатнага кіраўніка і таленавітага ўрача з'явілася мемарыяльная дошка. Чалавек, які ўсю вайну прайшоў на перадавой і нямала зрабіў у мірны час, гэтага заслугоўвае.

Вераніка КАНЮТА.
Фота з асабістага архіва Жанны КАЦЯНКОВАЙ

■

РАДКІ ПАМЯЦІ

Кожны дзень у «Звязду» ідуць пісьмы пра вайну, якая ў кожнага свая

Вялікая Айчынная вайна... Яна ў памяці кожнай беларускай сям'і. Ветэрана, які адважна змагаўся на фронце або ў партызанскім атрадзе. Працаўніка тылу, які аддаваў усё дзеля Перамогі. Жанчыны, якая штодзень малілася за свайго мужа або сына, што былі на перадавой. Падлетка, які нароўні з дарослымі змагаўся з ворагам. І нават дзіцяці, міжволі ўцягнутага ў гэты вялікі жах.

У кожнага была свая вайна. Памяць аб ёй перадаецца з пакалення ў пакаленне. Амаль за кожнай такой гісторыяй — трагедыя цэлай вёскі, усёй сям'і, асобнага чалавека... У некаторых была і іншая вайна, поўная асабістых перамог і высокіх званняў, славы і гонару. Пра гэта — у падборцы лістоў, якія штодзень папаўняюць рэдакцыйную скрыню.

ТРЫ ВАЙНЫ — НА АДЗІН ЛЁС

Святлана Кошур, старшы навуковы супрацоўнік Карэліцкага раённага краязнаўчага музея, расказвае пра сваіх землякоў, якія ў гады Вялікай Айчыннай змагаліся з ворагам далёка ад дому. Адзін з іх — ураджэнец вёскі Вялікая Слабада, генерал-лейтэнант Аляксандр Пулка-Дзмітрыеў.

«Прафесійны ваенны нарадзіўся ў 1893 годзе ў сям'і селяніна. У 1909 годзе скончыў вышэйшае пачатковае вучылішча, затым — настаўніцкія курсы пры Навагрудскім гарадскім вучылішчы. Працу настаўнікам прыпыніла Першая сусветная вайна, у якой ён браў удзел. Удзельнічаў у грамадзянскай вайне. Пасля вучыўся ў Ваеннай акадэміі імя Фрунзэ, скончыў Акадэмію Генеральнага штаба Чырвонай Арміі. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ўзначальваў інтэнданцкую акадэмію.

З 1942 года наш зямляк знаходзіўся на Паўднёва-Заходнім, Бранскім, Цэнтральным, Беларускім і Прыбалтыйскіх франтах. Займаў пасады начальніка штаба ўпраўлення тылу фронту, намесніка камандуючага арміяй па тыле і начальніка штаба арміі. Аляксандр Дзмітрыевіч — удзельнік Сталінградскай бітвы і бітвы на Курскай дузе. Вызваляў Беларусь, Прыбалтыку, Польшчу, удзельнічаў у Берлінскай аперацыі. Пасля вайны, у 1952 годзе, быў назначаны начальнікам штаба і першым намеснікам камандуючага войскамі Беларускай ваеннай акругі».

Расказвае аўтарка і пра яшчэ аднаго земляка, удзельніка войнаў Андрэя Карпа. У сям'і яго ўнука, Уладзіміра Кушаля, захавалася некалькі ўнікальных фотаздымкаў. На адным з іх — Андрэй Карп у форме салдата Першай сусветнай вайны са сваім таварышам *(на фота справа)*. Ужо тады яму давялося аказваць

дапамогу параненым аднапалчанам. Пра гэта сведчыць атрыманы ім медаль Чырвонага Крыжа, які ў 1906 годзе быў заснаваны па загадзе імператара Мікалая II. Ім узнагароджвалі ўрачоў, санітараў, сясцёр міласэрнасці, усіх тых, хто ў ваенны час браў удзел у дзейнасці Расійскага Чырвонага Крыжа, а пасля 1907 года — і вайскоўцаў.

«У час грамадзянскай вайны арміі патрэбны былі медыкі, — удакладняе Святлана Кошур. — У 1918 годзе Андрэй Карп скончыў фельчарскую школу ў Смаленску і атрымаў пасведчанне. Некаторы час працаваў у Маскве ў інфекцыйным шпіталі, а з мая 1918 года стаў штатным фельчарам Тульскага ваеннага лазарэта... Медыцынскі вопыт вельмі спатрэбіўся Андрэю Сільвестравічу ў час Вялікай Айчыннай вайны. У пачатку вайны ў будынку Вялікаслабодскай школы ён арганізаваў лазарэт, дзе аказваў дапамогу параненым чырвонаармейцам, якім у той час даводзілася адступаць. Здаралася, да яго ноччу прыходзілі партызаны, забіралі ў атрад, дзе ён рабіў перавязку параненым, лячыў партызанаў і іх сем'і. Дапамагаў ён і іншым людзям, хаця лекаў катастрафічна не хапала і, каб зрабіць лячэбную мазь, фельчару часам даводзілася выменьваць патрэбныя для яе інгрэдыенты на прадукты».

І ў гэтай сям'і была свая вайна.
У нястачы, голадзе, холадзе,
без даху над галавой.
У штодзённым чаканні вестачкі
з фронту, у той жудаснай навіне
аб страце карміцеля.

Я З ВОГНЕННАЙ ВЁСКІ, З СІНЯЎСКАЙ СЛАБАДЫ...

У кантэксце ўспамінаў пра вайну варта ўзгадаць і яшчэ адну вёску Карэліцкага раёна — Сіняўскую Слабаду. Вядома, і адсюль былі людзі, якія праславілі сваю малую радзіму на франтах Вялікай Айчыннай. Нарадзіўся тут і Уладзімір Калеснік, удзельнік партызанскага руху, адзін з аўтараў кнігі «Я з вогненнай вёскі...» Яго радзіма таксама была вогненнай вёскай.

У Сіняўскай Слабадзе нарадзілася і мясцовая паэтка Зінаіда Балабановіч. Яна не раз расказвала пра трагічны лёс сваёй вёскі. Яе аповед захавала зямлячка, Таісія Сабалеўская, якая падзялілася з намі гэтымі ўспамінамі:

«Да вайны наша вёска была вельмі прыгожай, шматлюднай. Вакол яе — цёмна-зялёны лес, які лагодна абдымалі хвалі сінявата-блакітнага Нёмана. Ён у тыя часы быў шырокі і глыбокі. Вакол вёскі — заліўныя лугі, сенажаці. Любімая рачулка Ціхая, шматлікія азёры, у якіх мачылі каноплі, пукі лёну. Добрыя, працавітыя людзі жылі ў вёсцы. У кожнага быў свой падворак, багаты на ўсялякую жыўнасць, свая гаспадарка: зямля, лес, сенажаць. Была ў вёсцы царква, пачатковая школа, месца для адпачынку. Усё разбурыла вайна. Калі яна пачалася, мне было 6 гадоў».

Бяда здарылася ў верасні 1942 года. Гэты страшны дзень прыпаў на вялікае свята. За два месяцы перад гэтым немцы паабяцалі мясцовым жыхарам спаліць вёску за дапамогу партызанам. Сваё слова стрымалі.

Пажар пачаўся з канца вёскі. Хаты амаль усе былі пакрытыя саломай, туліліся непадалёку адна ад адной. Гумно і хлявы поўніліся ад гаспадарчага набытку: амаль на носе была зіма. Усё гарэла, трашчала і палыхала. На шчасце, людзі засталіся жывыя.

Сям'я Балабановічаў падалася ў мястэчка Турэц. Тут былі родныя маці і бацькі Зінаіды. Там ужо жылі пагарэльцы, але ж і ім знайшлося месца.

«Прыйшлося жабраваць, — успамінала жанчына. — Людзі былі добрыя. Усё давалі. А ў пачатку красавіка 1944 года прыйшло вызваленне. Бацька з вайны не вярнуўся. Паспеў здзейсніць подзвіг на Одэры, паблізу вёскі Берзін. Узнагароду пасмяротна ўручылі маці ў 1953 годзе. Цяжкая праца лягла на яе плечы. Адкуль браліся ў яе сілы?»

І ў гэтай сям'і была свая вайна. У нястачы, голадзе, холадзе, без даху над галавой. У штодзённым чаканні вестачкі з фронту, у той жудаснай навіне аб страце карміцеля. У цяжкім, жабрацкім дзяцінстве, абдзеленым увагай бацькоў, якія ўсе свае сілы аддавалі дзеля будучай Перамогі.

«ЗАХОЎВАЦЬ І БЕРАГЧЫ ПАМЯЦЬ — НАШ ДУХОЎНЫ АБАВЯЗАК»

Так думаюць вучаніцы Мілевіцкага дзіцячага сада — сярэдняй школы, што ў Жыткавіцкім раёне, Тацяна Дарафей, Наталля Емяльянава, Марыя Катовіч і расказваюць пра родную вёску Мілевічы, якая падзяліла трагічны лёс Хатыні і дзясяткаў іншых населеных пунктаў. Школьніцы сабралі ўспаміны тых, каму пашчасціла ў той дзень адсутнічаць у вёсцы. Гэтых падлеткаў гітлераўцы прымусілі гнаць скаціну на Морач. Пазней менавіта яны будуць сведчыць пра нечуваныя звярствы таго трагічнага дня 15 лютага.

З успамінаў Івана Маркавіча Ефімовіча (памёр у 2004 годзе):

«Вярнуўшыся позна ўвечары, маці сказала, што немцы паляць навакольныя вёскі і хутары, расстрэльваюць людзей. Забілі шасцярых юнакоў з вёскі Старыя Залюцічы, якія адганялі жывёлу. Трэба ратавацца. Маці раіла ісці ў лес мне аднаму: мае брацікі і сястрычкі маленькія. Стаяла суровая зіма, і тлела надзея, што фашысты не крануць дзяцей. Уначы разам з сябрам Нікіфарам Тарцаном мы падаліся за Случ. На наступны дзень з боку вёскі пачуліся стрэлы, крыкі людзей. Я залез на высокае дрэва, каб было лепш відаць. Частку жыхароў Старых Мілевіч сагналі ў хлеў Агрыпіны Хаміцэвіч, астатніх — у хату Сачыловіча, што непадалёк ад ракі. Тых, хто супраціўляўся, забівалі і кідалі ў будынкі нежывымі. Навокал стаялі салдаты з аўтаматамі. Тых, хто спрабаваў уцячы, расстрэльвалі. Так працягвалася некалькі гадзін. Апоўдні хлеў і хата запалалі...»

На наступны дзень карнікі пакінулі вёску. Тыя, хто ўратаваўся, пачалі хаваць ахвяр зверства. Стала вядома, што загінула больш за 400 чалавек. У той жа дзень у суседняй вёсцы Беразнякі згарэлі 200 мірных жыхароў, з іх 71 чалавек — дзеці да 15 гадоў.

З успамінаў Евы Васільеўны Ефімовіч, 1929 года нараджэння:

«Узімку 1942 года мне было 12 гадоў. Усе здарылася ў лютым. Напярэдадні хадзілі чуткі, што немцы паляць людзей у суседніх вёсках. Бацькі не верылі ў тое, што немцы зробяць гэтак, а вось мая баба — наадварот. Самай раніцай бабуля сказала, што пойдзем з Еўкаю ў лес лучыну шукаць. У глыбіні лесу пачулі незразумелую гаворку. Нас заўважылі немцы, якія прачэсвалі лес перад аблавай, і пагналі назад дадому. Ужо ў вёсцы немец падштурхнуў мяне да падлеткаў, якім было загадана гнаць скаціну ў Старобін. Сярод усіх я была самай меншай.

У Старобіне ў нейкай старой школе мы прабылі два тыдні. Наступныя дні нас «грузілі» і звозілі ў мінскую турму для адпраўкі ў Германію. У цягнік запіхалі, як тое быдла. Толькі там-сям праз шчыліны прасочвалася сонечнае святло. Ехалі на працягу трох сутак. Ужо ў Германіі я трапіла ў маёнтак немца, дзе знаходзіліся і палякі, і французы, і італьянцы. Усе жылі ў бараку. Працавалі пераважна на полі: палолі нават пшаніцу, голымі рукамі вырывалі асот, а ён жа такі заразлівы. Рву ды плачу-плачу. Праз дзень усе пальцы і далоні пакрываліся гнойнымі пухірамі. Там мяне ўсе звалі Малюска, бо была сярод усіх не толькі самай маладой, але і самай маленькай.

Ежы, якую нам давалі, нікому не хапала. На сямёра чалавек выдавалі 3 літры малака (на 2 тыдні), праз дзень — адзін бохан хлеба, адзін пачак маргарыну і сахарын, астатняе варылі самі. На полі кралі пшаніцу. З вялікіх камянёў зрабілі жорны: змелем крадзенае зерне — ды спячом сякі-такі хлеб. Кожны з палонных баяўся захварэць, бо ўрачоў тут не было. Захварэў — памёр».

У гэтых мазаічных успамінах былых зняволеных — гісторыя часткі маладога пакалення часоў Вялікай Айчыннай вайны. Захоўваць і берагчы памяць пра іх і ўвогуле пра тыя падзеі, якія адбываліся на нашай зямлі 70 і больш гадоў таму, — сапраўды наш духоўны абавязак перад самімі сабой, перад нашчадкамі. І яна, гэтая памяць, павінна перадавацца з пакалення ў пакаленне, як нязгасны факел вялікай любові да Радзімы, да свайго народа.

Вераніка КАНЮТА.

■ Гісторыя газеты — гісторыя краіны

З НАДЗЕЯЙ НА МІР

Што пісала «Звязда» пра Арганізацыю Аб'яднаных Нацый у 1945-м

Сёлета Арганізацыя Аб'яднаных Нацый святкуе 70-гадовы юбілей. Яшчэ да пачатку Другой сусветнай вайны стала зразумела, што Ліга Нацый, міжнародная арганізацыя, утвораная ў 1920 годзе з мэтай урэгулявання спрэчак паміж краінамі шляхам дыпламатычных перамоў, не выконвае сваіх задач. У пачатку 1940-х пачалі распрацоўваць структуру і мэты новай міжнароднай арганізацыі. Нарэшце, падчас канферэнцыі ў Сан-Францыска, якая праходзіла з красавіка па чэрвень 1945 года, быў зацверджаны Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Падпісаны ён быў 26 чэрвеня 1945 года прадстаўнікамі 50 краін, сярод якіх была і Беларуская ССР. Статут уступіў у сілу 24 кастрычніка 1945 года — гэты дзень цяпер святкуецца як Дзень Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Да пачатку канферэнцыі ў Сан-Францыска Беларусь ужо была вызвалена ад фашысцкіх захопнікаў. «Звязда», якая не пераставала выходзіць і ў часы акупацыі, канчаткова аднавіла сваю працу і выходзіла ўжо штодзённа — акрамя панядзелка. Большасць матэрыялаў была прысвечана аднаўленню краіны і перамогам Чырвонай Арміі. Аднак не абмінала ўвагай наша газета і працэс утварэння ААН — на сёння ці не самай паважанай і ўплывовай у свеце міжнароднай арганізацыі. Прапануем вам невялікую падборку вытрымак са «Звязды» за 1945 год на гэту тэму. Арфаграфія таго часу захавана.

* * *

«Дзяржаўны сакратар ЗША Стэтыніус [Дзяржаўны сакратар ЗША ў 1944-1945 гг., першы Пастаянны прадстаўнік ЗША пры ААН у 1945-1946 гг. — **Аўт.**] заявіў на прэс-канферэнцыі ў Вашынгтоне, што прэзідэнт Рузвельт рашыў не патрабаваць для Злучаных Штатаў трох галасоў у Асамблеі праектуемай Міжнароднай арганізацыі. Аднак, сказаў Стэтыніус, гэтае рашэнне ніякім чынам не змяняе абяцання Рузвельта, данага ім у Крыму, падтрымаць патрабаванне Совецкага Саюза аб прадастаўленні месц у Асамблеі Украіне і Беларусі. <...> У заяве Стэтыніуса гаворыцца, што «Совецкія прадстаўнікі ў Ялце прапанавалі, каб Беларуская і Украінскія рэспублікі былі першапачатковымі членамі прапануемай Міжнароднай арганізацыі. Гэтае пытанне павінны вырашыць Аб'яднаныя Нацыі, якія збяруцца ў Сан-Францыска. Улічваючы важнасць, якую Совецкі Урад надаваў гэтай прапанове, амерыканскія прадстаўнікі ў Ялце, поўныя найглыбейшай павагі да гераічнай ролі, адыгранай насельніцтвам гэтых рэспублік у яго непахісным супраціўленні агульнаму ворагу, і да стойкасці, з якой яно вынесла вялікія пакуты ў часе вайны, згадзіліся, каб урад Злучаных Штатаў падтрымаў такога роду совецкую прапанову ў Сан-Францыска, у выпадку, калі яна будзе зроблена». (№62 (7388) ад 6 красавіка 1945 года)

* * *

«Сан-Францыска, 24 красавіка. (Спец. кар. ТАСС) Сёння ўдзень у Сан-Францыска на самалёце прыбылі В.М. Молатаў [міністр замежных спраў СССР у 1939-1949 гг. — **Аўт.**] і совецкія дэлегаты на канферэнцыю ў Сан-Францыска. Разам з тав. Молатавым прыбылі тт. Грамыка, Собалеў, Царапкін, Славін, Галунскі, Крылоў, Кузнецоў і генерал Васільеў». (№76 (7403) ад 26.04.1945)

* * *

«Сан-Францыска, 25 красавіка. (Спец. кар. ТАСС) Сёння ў 16 гадзін 30 мінут па ціхаакіянскаму часу, г. зн. 26 красавіка ў 2 гадзіны 30 мінут па маскоўскаму часу, адкрылася Канферэнцыя Аб'яднаных Нацый для падрыхтоўкі статута Усеагульнай Міжнароднай Арганізацыі па падтрыманню міру і бяспекі. Прысутнічае звыш 850 дэлегатаў». (№76 (7403) ад 26.04.1945)

* * *

«На пытанні прадстаўнікоў друку, як адаб'ецца на прымяненні атамнай бомбы стварэнне арганізацыі Аб'яднаных нацый, Бірнс [Дзяржаўны сакратар ЗША ў 1945-1947 гг. — **Аўт.**] заявіў, што атамная бомба знаходзіцца ў такім жа становішчы, як і ўсякі іншы сродак вайны. Адказваючы на пытанне, у якім было выказана меркаванне, што совет бяспекі можа патрабаваць устанаўлення кантролю над атамнай бомбай, Бірнс заявіў, што ён не жадае абмяркоўваць пытанне аб совеце бяспекі, аднак указаў, што права вето прымяніма да ўзброенняў». (№ 171 (7497) ад 7.09.1945)

* * *

«Перад Аб'еднанымі нацыямі стаіць зараз задача захаваць мір і паспяхова пераадолець цяжкасці, узнікшыя ў выніку вайны. Прадстаячая ў бліжэйшы час сустрэча ў Лондане міністраў замежных спраў пяці вялікіх дзяржаў,



Прыбыццё тав. В. М. Молатава і членаў совецкай дэлегацыі у Сан-Францыска

Адкрыццё канферэнцыі Аб'еднаных Нацый у Сан-Францыска

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ У ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

безумоўна, з'явіцца важнай вехай на гэтым шляху. Яна, як указвае замежны друк, павінна ўмацаваць у народаў надзею на трывалы і працяглы мір». (№ 173 (7499) ад 9.09.1945)

* * *

«Вечарам 28 верасня ў Лондане было апублікавана камюніке, у якім гаворыцца, што пасля тыднёвага перапынку выканаўчы камітэт падрыхтоўчай камісіі арганізацыі Аб'еднаных Нацый зноў правёў 28 верасня паседжанне ў Лондане. Старшынствуваў Грамыка. На паседжанні было абвешчана паведамленне з Вашынгтона аб тым, што да гэтага часу 26 дзяржаў шляхам законадаўчай працэдуры ратыфікавалі статут Аб'еднаных нацый, прычым 7 ратыфікацыйных грамат перададзены ўжо ў Вашынгтон. Арганізацыя пачне сваё існаванне, калі ўрадам ЗША будуць атрыманы 29 ратыфікацыйных грамат». («Звязда», №189 (7515) ад 1.10.1945)

Андрэй Грамыка. Даведка

Наш зямляк Андрэй Андрэевіч Грамыка (нарадзіўся ў вёсцы Старыя Грамыкі Гомельскага павета ў 1909 годзе, памёр у Маскве ў 1989-м) — савецкі дыпламат і дзяржаўны дзеяч, у 1957—1985 гадах — міністр замежных спраў СССР, у 1985—1988 гадах — старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

У 1944 годзе Грамыка ўзначальваў савецкую дэлегацыю на міжнароднай канферэнцыі ў Вашынгтоне па праблеме стварэння Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. У 1945 годзе ўдзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні Ялцінскай канферэнцыі ў Крыме, а таксама ў канферэнцыі ў Патсдаме. У тым жа годзе кіраваў дэлегацыяй, якая падпісала Статут ААН ад імя СССР на канферэнцыі ў Сан-Францыска.

* * *

«Вашынгтон, 24 кастрычніка (ТАСС). Сёння ў 1 г. 45 м. па Грынвічу дзяржаўны сакратар ЗША Бірнс падпісаў пратакол, у якім гаворыцца, што Статут Аб'еднаных нацый уступіў у сілу. На цэрэманіі ў Дзяржаўным дэпартаменце, якую здымалі шматлікія фотарэпарцёры, Бірнс зачытаў заяву, у якой гаворыцца:

«<...> Гэта — памятны дзень для міралюбівых народаў усіх краін. Як я не раз гаварыў, падтрыманне міру залежыць не ад якога-небудзь дакумента, а ад мысляў і пачуццяў людзей. Народы зямнога шара, жадаючыя міру, павінны арганізавацца для таго, каб падтрымліваць гэты мір. Гэты статут прадугледжвае арганізацыю. У цяперашнія дні мы зробім усё магчымае ў супрацоўніцтве з другімі аб'еднанымі нацыямі для таго, каб захаваць мір і садзейнічаць дабрабыту ўсіх народаў» (№206 (7533) ад 26.10. 1945).

Дасягненні міратворчай палітыкі ААН. Даведка

Дзякуючы менавіта ААН многія канфлікты не перараслі ў поўнамаштабныя войны. Пры дапамозе перамоў гэтая арганізацыя шмат разоў змагла дабіцца мірнага ўрэгулявання розных канфліктаў. ААН неаднаразова забяспечвала механізм для нейтралізацыі патэнцыйных канфліктаў, у прыватнасці, кубінскага ракетнага крызісу (1962) і блізкаўсходняга крызісу (1973). У гэтых выпадках умяшанне ААН дапамагло прадухіліць войны паміж звышдзяржавамі.

Акрамя таго, ААН належыць важная роля ў спыненні вайны ў Конга (1964), вайны паміж Іранам і Іракам (1988), войнаў у Сальвадоры (1992) і Гватэмале (1996). Дзякуючы намаганням ААН быў дасягнуты мір, які забяспечыў устойлівы эканамічны рост у Мазамбіку (1994) і незалежнасць Тымора-Лешці (2002), а ў снежні 2005 года Арганізацыя паспяхова завяршыла сваю міратворчую місію ў Сьера-Леонэ.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■